**Маёрава, Г.** Паштоўка пра земляка / Г. Маёрава // Віцебскі рабочы. — 1987. — 5 мая.

## ПАШТОЎКА ПРА ЗЕМЛЯКА

Напярэдадні XX з'езда камсамола выдавецтва «Плакат» выпусціла камплект буйнафарматных паштовак «Працяг подзвігу». Ён пра тых, хто выканаў свой інтэрнацыянальны абавязак, абараняючы ў Афганістане заваёвы Красавіцкай рэвалюцыі.

Чытачы, магчыма, знаёмы з папярэднім выпускам, у якім расказвалася аб дваццаці чатырох Героях Савецкага Саюза – прафесійных ваенных, афіцэрах, воінах, удастоеных гэтага высокага звання пасмяротна.

Цяперашняе ж выданне – пра тых, хто вярнуўся з поля бою, каго цяпер можна сустрэць у заводскіх цэхах, на будаўнічых пляцоўках, у студэнцкіх аўдыторыях.

Адзін з тых, каму прысвечаны новы камплект паштовак – на іх змешчаны партрэты і кароткія біяграфіі нядаўніх воінаў-інтэрнацыяналістаў і замалёўкі пра іх – наш зямляк Анатоль Цíркуноў, ураджэнец вёскі Судзілавічы Дубровенскага раёна.

У Афганістане Цíркуноў быў камандзірам баявой машыны пяхоты. Яго мотастралковая часць суправаджала аўтакалоны з мірным грузам для насельніцтва, патрулявала дарогі, выконвала заданні па ліквідацыі душманскіх бандаў. Што ні выезд – то бой!

І ў кожным баі ў Анатоля была галоўная мэта: любой цаной перамагчы ворага.

Аднойчы машыну Цíркунова атакавалі душманскія гранатамётчыкі. Кантузіла аператара-наводчыка. Толя заняў яго месца ідзейнічаў за дваіх.

У другі раз у час бою з вялікай бандай БМП прабіў снарад, заклініла пушку, мотастралкі спешыліся, працягваючы наступленне. Толя рухаўся ўздоўж арыка, выбіваў душманаў у сваім сектары. Калі ў аўтамаце скончыўся боезарад, спусціўся за валун, каб перазарадзіць дыскі. І тут непадалёку ўбачыў бандыта.

– Дрэш! (Стой) – і Толя кінуўся ўрукапашную, не даючы магчымасці таму апамятацца...

Гэта толькі эпізоды з баявога жыцця Анатоля Цíркунова.

Цяпер старшына запасу, кавалер ордэна Чырвонай Зоркі, жыве і працуе ў Мінску, будуе дарогі і масты. Летам мінулага года ён добраахвотна ўдзельнічаў у ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Анатоль яшчэ і актывіст. Ён нештатны карэспандэнт будаўнічай шматтыражкі.

Так працягваецца біяграфія нашага земляка камсамольца А. Цíркунова.

**Г. Маёрава**